# «БЛІСНЕ НА ПЛЯЧЫ ГІБІНКА СЯРПА, ТОНКІЯ РУКІ КРУЦЯЦЬ ВЯЗЬМО...»

## Жніво ў літаратурных творах

**Ну вось незаўважна і надышоў апошні месяц лета. Гэта ў кагосьці яшчэ канікулы ды водпускі, а на вёсцы — самая гарачая пара. Гарачая яна незалежна ад надвор'я — жніво... Час збору ўраджаю. Давайце паглядзім, як гэты час адлюстроўваўся на старонках твораў беларускіх літаратараў.**

### «І ЯК ПРЫГОЖА-СЛАЎНЫ БАБКІ! ЯКІЯ ЛАДНЫЯ ІХ ШАПКІ!»

Зразумела, любую вясковую працу можна знайсці ў беларускай паэтычнай «энцыклапедыі сялянскага жыцця», то-бок паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Класік добра ведаў, як здабываецца хлеб. Нават у сталым узросце, жывучы ў горадзе, каля свайго дома зладзіў участачак, на якім вырошчваў жыта ды праводзіў аграэксперыменты... А з дзяцінства засталіся ў яго памяці карціны жніва, асаблівая прыгажосць беларускіх жнек, чые постаці мільгаюць у моры збожжа:

*«Або калі над галавою*
*У жнейкі спрытнаю рукою*
*Пучок калоссяў мільгатнецца,*
*Апіша дужку, бы вясёлку,*
*Бы нейкай знічкі след пагаслы,*
*І борзда ляжа ў перавяслы,*
*Што распасцёрты на падолку, —*
*Дапраўды: ўзмахаў*
*гэтых мгненне —*
*Адна любота, заглядзенне!»*

Але вось скончана жніво, і паэт прапаноўвае чытачу разам палюбавацца на зжатае поле:

*«У якія роўныя шнурочкі*
*Цяпер пакладзены снапочкі!*
*І як прыгожа-слаўны бабкі!*
*Якія ладныя іх шапкі!*
*І хоць яны ўсе адзінакі,*
*Але і выраз і адзнакі*
*У кожнай бабкі асабісты,*
*А наагул усе фарсісты...»*

### «ЗАШАСТАЛІ ГЛУХА СЯРПЫ, ЯК НАЖЫ...»

А вось у Янкі Купалы вобраз жнейкі дваісты. У 1911-м ён піша знакаміты верш: *«Як сама царыца ў залатой кароне, йдзе яна ў вяночку паміж спелых гоняў... На грудзях шчаслівых каптанок ружовы, у руцэ сярпочак зублены, сталёвы...»* Гэтая жнейка каране песняй жніво і сама ўся як сонца... А вось у вершы «Жніво», напісаным годам раней, карціна зусім іншая, маркотная і нават злавесная, за радкамі адчуваецца туга паэта з-за таго, што не бачыць вынікаў сваёй працы:

*«І жнеі сышліся. —*
*Направа, налева*
*Кладучы ў снапы*
*каласы-старажы,*
*Зашасталі глуха сярпы, як нажы,*
*Пад жніўныя вечна старыя напевы.*

*Спагадная, нудная песня плыве,*
*Губляючы ў пушчы свае пералівы,*
*У шэлестах белага коласу нівы.*

*Плыве гэта песня ка мне і заве,*
*І ў сэрцы звініць, як каса ў траве:*
*«Ты так жа, брат, сееш...*
*а дзе твае жніва?»*



### «ХРУП! ХРУП! ХРУП! І ШАМАЕ ЖЫТА...»

Максім Гарэцкі ў абразку «Млявыя сненні» побытавыя карціны ўздымае да экзістэнцыяльнага роздуму. Сцэна жніва на ранішнім полі ператвараецца ў пакутлівыя развагі над такімі рознымі чалавечымі лёсамі:

*«Шарпае пад лёгкімі лапцікамі колкае і яшчэ поўнае соку іржышча. Грубыя, туга звязаныя снапы разлягліся, як купцы, бавячы погляд. Не хочацца думаць, што там, на ўзгорачку, на пясочку, ёсць і рэдзенькае, жыдзенькае, дробненькае жытца з малюсенькімі каласінкамі. Сумна там... Затое ж тут, дзе яно буйнае, дзе яно густае, — надта хораша!..*

*А нечыя жнеі прыйшлі ўжо на пастаць — пад самы лес. Лётаюць па-над жытнім морам каласяныя жмені і хаваюцца ў ім. Уздоймецца галава ў белай намётцы, блісне на плячы гібінка сярпа, тонкія рукі круцяць вязьмо. І зрок задумана стаіць на дальнім ускраі паласы-шнурочка... «Відзіць маё вочка, што край недалёчка! Відзіць жа і другое, што яшчэ ганей двое!..» Схавалася белая намётка, — узмятнулася чырвоная хустачка дзяўчыны... І дзве жмені, гнуткія, шумацяць, мятаюцца і мятаюцца.*

*Вуха з радасцю ловіць аднастайную музыку-ігранне сярпоў: хруп! хруп! хруп! І шамае жыта...»*

### «ЧЭЗЛЫЯ, РЭДКІЯ БАБКІ НЯДРУЖНА ЎСТАВАЛІ...»

У рамане Івана Мележа «Людзі на балоце» на полі падчас жніва віруюць нежартоўныя жарсці. Прыгажуня Ганна Чарнушка з бядняцкай сям'і рупна жне ды паглядае на каханага Васіля Дзятліка, чыя ніва таксама небагатая, а багацей Яўхім заглядаецца на Ганну... І кожнай працоўнай жыхары палескай вёскі Курані, не шкадуючы сіл, настрой журботны — неўрадлівая ў іх зямля, балоцістая...

*«Поле жыло ўжо іншым настроем, ціхай, шчымлівай журбою. Журба гэтая ішла не толькі ад таго, што поле галела, што ў ім адчуваўся ндзобры, пагібельны подых недалёкай восені... Чэзлыя, рэдкія бабкі, што нядружна ўставалі пад сумныя, падобныя на ціхае галошанне песні жанок-жней, былі як страшныя знакі марнасці, няспраўджанасці чалавечых надзей. Сіратлівыя бабкі гэтыя выглядам сваім як бы казалі: вось усё, на большае не спадзявайся, большага не будзе, гэта ўсё, чым магла адплаціць за працу няшчодрая на аддарункі тутэйшая зямля...*

*Спявала, дажынаючы паласу, і Ганна, якой час ад часу памагала, падгалошвала мачыха.*

*— Да перастаньце вы ўжэ, — не вытрываў нарэшце Чарнушка. — Усё роўна як на могілкі сабраліся везці!..»*

### «МЫ ЦАЛАВАЛІ ЗЕРНЕ, ПЕРШ ЧЫМ КІНУЦЬ ЯГО Ў РАЗОРЫ...»

Паэт-франтавік Кастусь Кірэенка напісаў верш «Ураджай» у 1945 годзе. У ім малюецца першае пасляваеннае лета — час, калі яшчэ крывавяць успаміны пра вайну, але трэба аднаўляць панішчаную ворагам гаспадарку:

*«Яшчэ нядаўна*
*першай навальніцай*
*Было абмыта поле, на якім,*
*Каб выгнаць з краю*
*лютых чужаніцаў,*
*Не раз мы падымаліся ў штыкі.*

*Яшчэ нядаўна песняй перамогі*
*Быў на зары абуджаны наш край,*
*А ўжо шумяць усходамі разлогі, —*
*Нясі нам шчасце,*
*сёлетні ўраджай!..*

*Мы цалавалі зерне,*
*перш чым кінуць*
*Яго ў разоры. Дружна, як на бой,*
*Выходзілі на працу золкам сінім,*
*Ўзбівалі глебу рупнаю рукой...*

*...І мы клянёмся,*
*што не ўчуем стомы,*
*Не дасядзім на йгрышчах,*
*недаспім!*
*Як серп вастрыць —*
*з маленства нам знаёма —*
*І жыта жаць пад сонцам залатым».*

### «ЗБЕРАГЧЫ ЗБОЖЖА, НЕ ДАЦЬ ЯГО Ў НЯМЕЦКІЯ РУКІ»

А вось у рамане Міхася Лынькова «Векапомныя дні» жніво адбываецца падчас вайны, на акупаванай Беларусі...

*«Быў той год ураджайны як ніколі. Жыты ў полі стаялі сцяной. Набіраліся сілы аўсы, ячмяні. На лугах такія выкінуліся травы, што хоць ты хавайся ў іх...*

*І ўся гэтая цвецень і багатая пладнасць зямлі не цешылі вока чалавека. Не ліпла рука да касы, да грабляў. Ды і мала было рук, а якія і былі, то менш за ўсё думалі аб касьбе, аб жніве...»*

Але партызанскі камандзір Саколіч разумее, што хлеб неабходны для барацьбы з акупантамі, таму заклікае партызан дапамагчы сабраць ураджай. Яго апанент Свістун лічыць, што гэта не вартая справа — «зробім развёрстку, вось вам і хлеб». То-бок няхай сяляне дадуць. Саколіч пярэчыць:

*«— Зрабіць развёрстку на гатовы хлеб — не хітрая справа. Гэта, выбачайце, і ўсякі дурань можа зрабіць. А вы памажыце народу мець ураджай, зберагчы збожжа, не даць яго ў нямецкія рукі.*

*— Вы, можа, загадаеце майму атраду яшчэ зямлю араць?*

*— Што ж, трэба будзе — і загадаем».*

Зразумела, праўда на баку Саколіча, і партызанскае жніво адбываецца.

### «ДВА СЯРПЫ ЗІХАЦЯЦЦА»

Паэма Петруся Броўкі «Хлеб» напісана ў жніўні 1946 года і таксама апавядае, як аднаўляюць людзі гаспадарку пасля нядаўняй ваеннай навалы. А на фоне таго, як жыта сеецца, як узыходзіць рунь, спеюць каласы і збіраецца ўраджай, разгортваецца каханне галоўных герояў, сейбіта і жнейкі. А ў фінальнай сцэне гуляюць разам і дажынкі, і вяселле.

*«Выйшлі людзі на працу,*
*А між імі са спрытам*
*Два сярпы зіхацяцца,*
*Тых, што сеялі жыта.*

*Жыта іхнія вочы*
*Між усіх распазнала:*
*Гэта іх яно ўночы*
*Ад вятроў прыкрывала.*

*Колькі ў цемры глыбокай*
*Чула любых размовы*
*Ды схавала далёка*
*Іх таемныя словы.*

*Роўна, роўна радамі*
*На шырокай лагчыне*
*Усцілаюць снапамі*
*Поле сейбіт з дзяўчынай.*

*Між сабой размаўляюць,*
*Добра ім, як ніколі.*
*Ставяць бабкі і знаюць —*
*Тут з'яднала іх доля.*

*А як выйшлі дадому*
*Познім, змрочлівым часам,*
*Нізка полю жытному*
*Пакланіліся разам».*

### «І ЧАС ЗАВЯРШАЦЬ ЗБОР КАЛОССЯ НА ПОЛІ»

Для Максіма Танка ў вершы «Збор калосся», напісаным у 1985 годзе, жніво — сімвал падрахункаў, якія падводзіць чалавек напрыканцы жыцця, а калоссі — напісаныя творы. Танку было ўжо семдзесят тры, у яго радках гучаць сум і настальгія, а яшчэ — радасць кожнаму новаму дню, які дае магчымасць сабраць яшчэ трохі калоссяў, стварыць яшчэ штосьці.

*«Хаця б не забыць, што*
*Даўно мінуў поўдзень*
*І час завяршаць*
*Збор калосся на полі.*

*Хаця б не забыць, што*
*Ноч не за гарамі,*
*І ўсім пажадаць*
*Добрага адпачынку.*

*Хаця б не забыць,*
*Калі заўтра пашчасціць*
*Убачыць світанне,*
*Падзякаваць сонцу,*

*Падзякаваць сонцу,*
*Што зноўку вярнула*
*Да любае працы —*
*Да збору калосся».*

### «НЕ ЖНЕЦ, А НІВА — ПОМНЮ ПРА ЖНІВО...»

Алесь Разанаў у «Паэме жніва» прыпадабняе жніву плён чалавечага жыцця. Чалавек — не жнец, а ніва. Ён сам з сябе павінен выспеліць ураджай і расціць не куколле, а зерне, якое нагадуе іншых.

*«Усё умеюць рукі, а душа... —*
*рыхтую да жніва душу:*
*ў бязлітаснай надзеі выспяляю*
*і ў скрусе загартоўваю зямной...*
*...Будзь прывітаны сёння і заўжды,*
*будзь прывітаны блізкі і далёкі,*
*пагляды не стае — убачыць,*
*і сэрца не стае — адведаць,*
*але цягнуся да цябе надзеяй,*
*адвечнай несмяротнаю надзеяй:*
*будзь прывітаны, час жніва.*
*Народжаны ад хлеба,*
*прагну хлеба —*
*пакуль жыву,*
*хачу спасцігнуць сэнс*
*дыханнем кожным,*
*кожнаю крывінкай,*
*і позіркам, і крокам, і людзьмі.*
*З нічога паўстаюць не для нічога,*
*а для жніва —*
*ці выспелю ўраджай?!*
*Я меркаваў: калі настане час...*
*А неабходна наставаць самому,*
*не жнец, а ніва — помню пра жніво...»*

### «І ТАМ СНАПАВОЗ У ДАРОЖАНЬКУ РУШЫЎ...»

У Рыгора Барадуліна ёсць незвычайны верш — «Снапавоз», у якім у даволі экспрэсіўных вобразах падаюцца будні жніва:

*«Трасянуў сваім чубам —*
*даспелым калоссем,*
*Падперазаўся вязьмом —*
*і ў абоз.*
*Асмужаны, вусам асцістым калоўся*
*І шлях па іржышчы*
*прамяў снапавоз...*

*Працуе — і ўсё ў яго*
*спорыцца, клеіцца.*
*Вачэй не зажмурыць*
*ад рос і да рос.*
*І круціць баранку,*
*натужвае лейцы,*
*Пыліць па ўсіх бальшаках*
*снапавоз.*

*Ад тупату, грукату, гоману —*
*тлумна.*
*І жытам прапахлі утулкі калёс.*
*Пустыя такі, падхартаныя гумны,*
*Прымайце, — вязе ураджай*
*снапавоз.*

*Зярнятамі зор Млечны Шлях*
*зацярушан —*
*І там снапавоз*
*у дарожаньку рушыў.*
*Шчаслівай дарогі табе,*
*снапавоз!»*

Давайце ж пажадаем спорнай работы тым, хто сёння працуе ў палях; каб надвор'е спрыяла, каб добрым быў настрой, каб залатымі былі і зернейкі, і зоры, і сэрцы, і рукі.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**